Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў першай палове XIX ст.

1. Беларуская мова ў творах пісьменнікаў першай паловы 19 ст.
2. Лінгвістычныя даследаванні Яна Чачота.
3. Творчасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў развіцці і фарміраванні беларускай літаратурнай мовы.

Беларуская мова ў творах пісьменнікаў першай паловы XIX ст.

Адным з першых беларускіх паэтаў новай беларускай літаратуры быў *Паўлюк Багрым* (1813-1891) – селянін з вёскі Крошын Навагрудскага павета. Захаваўся толькі адзін верш *“Заграй, заграй, хлопча малы”* (“Zahraj, zahraj, chłopcze mały”), прыведзены па памяці невядомым аўтарам у кнізе “Powieść z czasu mojego czyli przygody litewskie” (Лондан, 1854; Познань, 1858). Неўласцівыя для Навагрудчыны, як і для ўсёй беларускай мовы, у вершы з’явы захавання ненаціскнога [э] пасля шыпячых у канцы слоў (*bezdaroże, nieboracze, chłopcze*) і [н’] у слове *pańszczynu*.

Вядомая асоба першай паловы 19 ст. – *Аляксандр Радван Рыпінскі*

пісьменнік і фалькларыст, які стаў эмігрантам як удзельнік паўстання 1831 г. Ён правёў шмат гадоў у Парыжы, дзе пазнаёміўся з А. Міцкевічам перад тым, як пераехаў у Лондан у 1846 г. і заснаваў там друкарню ў Тотэнхеме. Вядомы як аўтар этнаграфічнай працы *“Беларусь”* (Białorus. Kilka słów o poezji prostego ludu tej naszej polskiej prowincji; o jego muzyce, śpiewie, tańcach, etc., Парыж, 1840) і папулярнай камічнай балады *“Нячысцік”* (Niaczyścik, ballada białoruska, Лондан, 1853).

З беларускамоўных твораў Я. Баршчэўскага захаваліся:

вершы *“Ах, чым жа твая, дзеванька, галоўка занята”* (“Ach czymże twaja dzieweńka hałouka zaniata”, напісаны ў 1809 г.),

“Гарэліца” (“Harelica”) – 1843 г., “Rocznik literacki” (Пецярбург),

урывак з паэмы *“Рабункі мужыкоў”* (“Rabunki mużykou”, 1812), аб паводзінах сялян пасля таго, як іх гаспадары збеглі ад арміі Напалеона на ўсход.

Урывак надрукаваны ў прадмове Р. Падбярэскага да кнігі Я. Баршчэўскага “Шляхціц Завальня”. Невялічкі ўрывак паэмы прыведзены ў кнізе А. Рыпінскага “Беларусь..” з назвай “Бунт сялян супраць эканома” (“Bunt chłopów przeciw ekonomowi”)

Творы А. Рыпінскага і Я. Баршчэўскага з правапіснага і граматычнага боку мовы прынцыпова не адрозніваюцца

Арфаграфічныя адметнасці:

- пераднаціскное аканне, яканне: *wajnu, wialiki, haława, nia mnoha, ciaper;*
- часам дысімілятыўнае аканне і яканне ў канчатках і суфіксах: *budzić, dalij*, *choczyć, czuić,* Адметна, што ўласцівае паўночна-ўсходняй гаворцы дысімілятыўнае аканне-яканне ў творах Я. Баршчэўскага і А. Рыпінскага амаль не перадаецца. Недысімілятыўны варыянт быў свядома абраны пісьменнікамі, відаць, з прычыны тэрытарыяльнай абмежаванасці дысімілятыўнага варыянта;
- дзеканне, цеканне: *dzień, dźwie, dzieci, chodzić*;
- пераход *в, л – ў* (праз *u*, у “Беларусі” ўпершыню сустракаецца значок *û*): *byu, douha, panou; żyć i ûmierać, chacieû*;
- зацвярдзенне шыпячых: *nocz, prykażyć, uczora*;
- А. Рыпінскі перадаў [р] цвёрды, Я. Баршчэўскі – і мяккі, і цвёрды: *harełka, hrech, paradak; prinosić, prilaceli*;
- часам асіміляцыя па мяккасці: *pośle, ścieny, ułaść*.

З *марфалагічных* з’яў выдзяляюцца:

- канчатак *-ць* у форме 3 асобы адзіночнага ліку дзеясловаў цяперашняга часу: *biareć, wodzić, pronosić, chapaječ*;
- інфінітывы на *–ць: ablić, bvć, ieść, kłaść, prvnieść, skakać;*

Лінгвістычныя даследаванні Яна Чачота

- Першы з 6 выпускаў *“Сялянскіх песенек”* Я. Чачота надрукаваны ў 1837 г., апошні – у 1846 г. (“Piosenki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny, niektóre przysłowia i idiotyzmy w mowie sławiano-krewickiej, z potrzeżeniami nad nią uczynionemi”, Wilno) [16, с. 40]. У прадмове да першага зборніка паэт абяцаў з часам выдаць пераклады беларусіх песень з тэкстам арыгіналаў.
- У 4 зборніку (1844) Я. Чачот змясціў 19 арыгінальных беларускіх песень, польскія пераклады якіх публікаваў у папярэдніх кнігах, а таксама 27 “уласных сялянскіх песенек”, напісаных па-беларуску і перакладзеных на польскую мову. Гэта зборнік сведчыў пра пэўны зрух у творчасці Я. Чачота: паралельна з запісамі беларускіх народных песень на мове арыгінала і іх польскімі перакладамі з’яўляюцца ўласныя беларускамоўныя вершы паэта і іх адпаведнікі – пераклады на польскую мову. Зрух адбываўся ў бок папулярызацыі народнай песні ў арыгінальным гучанні і беларускамоўнай “літаратурнай” песнятворчасці.

Беларускую мову Я. Чачот называе ў пераважнай большасці выпадкаў дыялектам *крывіцкім*

У 40-я гады XIX ст. не існавала адзінага тэрміна для назвы насельнікаў Беларусі.

В. Дунін-Марцінкевіч называў сябе *ліцвінам,* а сваіх сяброў з Віцебшчыны – *беларусамі*. Ліцвінскасць навагрудцы трымалі моцна. Прыгадаем А. Міцкевіча: “Litwo! Ojczyzno moja!” (“Літва! Айчына мая!”).

Падараваны царом тэрмін *Белорусские губернии* афіцыйна ў 1842 г. быў забаронены і заменены на *Северо-Западный край*.

Пакінуўшы задачу “пры ўстанаўленні правапісу клапаціцца пра этымалогію” будучаму больш падрыхтаванаму граматысту, Я. Чачот “стараўся пісаць так, як вымаўляецца”.

У сваіх беларускіх творах ён пісаў па прынцыпу “як чуецца” толькі галосныя, а зычныя пісаў, помнячы пра этымалогію.

Я. Чачот усведамляў, што ва ўмовах новай беларускай літаратурнай мовы, якая толькі зараджаецца, цяжка гаварыць аб выпрацоўцы якога-небудзь больш-менш дасканалага правапісу, і прапанаваў, па сутнасці, сумясціць фанетычны і этымалагічна-марфалагічны прынцыпы, якія сам імкнуўся выкарыстоўваць пры напісанні беларускіх вершаў.

Ян Чачот паклаў пачатак беларускай практычнай лексікаграфіі. У 6 зборніку 1846 г. змешчаны *тры слоўнікі* розных тыпаў:

1 – невялікі (на 200 рэестравых слоў) – “Слоўнік крывіцкіх слоў” (“Słownik wyrazów krewickich, mniej zrozumiałych, w tych się piosenkach znajdujących z tłumaczeniem”) пабудаваны па тыпу перакладнога з элементамі гняздовасці, дзе беларускія словы перакладаюцца на польскую мову: *chachoł , a, m – czub*;

2 – тлумачальны – “Некаторыя крывіцкія словы” (“Niektóre idyotyzmy (własnonazwy) krewickie”) – на 231 слова. Тлумачэнні даюцца разгорнутыя, апісальныя, часам з параўнаннем з іншымі мовамі (у перакладзе): *Дуля, дулька, і, ж. Грушкі, якія называюцца ў Літве па-крывіцку дулямі; па-польску таксама сорт грушак, або дуля земляная, што значыць рэпа лясная, сьвіняк. Чэшск. гдуле, пігва (malum cydonium). Серб. дуля, тое ж самае. Расійск. дуля, грушка*;

3 – “Прыказкі крывіцкія” (“Przysłowia Krewickie”) – фразеалагічны слоўнік, які змяшчае 130 прыказак у перакладзе на польскую мову, некаторыя з тлумачэннямі: *Baba z kalos – kalosam lachczej. Baba z wozu – wozowi łżej (o odrzucającym łaskę jaką).* Асобна даюцца яшчэ 15 “Прыказак, прыстасаваных да свят” (*грамніца – зімы палавіца*), 40 “Канкрэтных выразаў і параўнанняў, якія могуць лічыцца за прыказкі” (*лёстачкамі душу вынімаць; хто пытае, той не блудзіць*) і яшчэ 12 “Прыказак польскіх, прыстасаваных да свят”

Творчасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў развіцці і фарміраванні беларускай літаратурнай мовы

В. Дунін-Марцінкевіч стаў пачынальнікам беларускай драматургіі. Першым творам, дзе ён звярнуўся да беларускай мовы, была камедыя *“Сялянка”* (Sielanka. Opera we dwóch aktach, Вільня, 1846). Пры жыцці аўтара выйшлі ў свет паэма *“Гапон”* і верш *“Павіншаванне войта Навума”*, змешчаныя разам з польскімі вершамі ў зборніку “Гапон. Аповесць беларуская, з праўдзівага здарэння, напісаная на мове беларускага народа” (Мінск, 1855, Hapon. Powieść białoruska, z prawdziwego zdarzenia, w języku białoruskiego ludu napisana), паэма *“Купала”* (зборнік “Цікавішся? Прачытай!” – Мінск, 1856, Ciekawyś? Przeczytaj), паэма *“Шчароўскія дажынкі”* і *“Верш Навума Прыгаворкі”* (зборнік “Дудар беларускі, або ўсяго пакрысе” – Мінск, 1857, Dudarz białoruski, czyli wszystkiego potrosze). Камедыі *“Пінская шляхта”* і *“Залеты”* ўбачылі свет толькі ў XX ст.

Фанетычна-арфаграфічныя асаблівасці:

- недысімілятыўнае аканне: *daloka, naspadary, piwa, soładka*;
- захаванне ненаціскнога [э] пасля шыпячых і [р]: *bliżej, panoczek, rycerstwa, czerwiaczok*;
- імкненне перадаваць моцнае яканне: *białarusy, wiasialiła, ziamla, piarastanuć,* але: *bieda, pierestanie*;
- выпадкі дысімілятыўнага якання: *bolij, drobnińkije, milińkago, pacirajesz, uhledziú*;
- афрыката *дж* на месцы старажытнага **dj* толькі ў слове *pa dażdży*, а ў астатніх – ужываецца *ж: rażu, rażenago, sażajuć*, а часам – *дз: zradzony, piered naradzeńniam,*;
- непаслядоўная перадача прыстаўных зычных і галосных: *ab obrazie, woka, u waczach, u wosień, uczyu; ahurkami, mczycca, szoú,*;
- на месцы старажытнага рэдукаванага, які спалучаўся з плаўным зычным, часцей ужываецца не *ы*, а *о* (пад націскам) і *а* (не пад націскам): *krawawy, trawohu, czarwony*;
- зычныя *н, с, з* у некаторых словах ужываюцца мякка перад цвёрдымі зычнымі: *kańcy, kraśna, pahańca, pańskaja*;
- [с’] у суфіксе *-ск-: Dnieproúśkaja*, *zamorśki, kiepśka, pa maskoúśki, ruśki;*
- пад уплывам рускай арфаграфіі не перадаецца асіміляцыя на стыку марфем: *siemnadcać, u dwadcatam*;
- як у рускай мове, аглушаюцца прыназоўнікі *ад, з: at Alony, at miacialicy, atdać, s ahnia, s żytam, s nami.*

У 1859 г. у Вільні надрукаваны пераклад В. Дуніна-Марцінкевіча на беларускую мову першых дзвюх частак паэмы А. Міцкевіча *“Пан Тадэвуш”* (Pan Tadeusz. Dwanadcać szlacheckich bylic, napisaŭ Adam Mickiewicz. Piarawiarnuŭ na Białaruskuju haworku Wincenty Dunin-Marcinkiewicz).

Гэта першая ў поўным значэнні слова беларуская кніжка. Раней беларускія творы друкаваліся ў рускіх ці польскіх выданнях, у польскіх зборніках. Нават асобныя творы, як “Нячысцік” Рыпінскага, мелі польскі загаловак і прадмову.

- У перакладзе паэмы “Пан Тадэвуш” у параўнанні з арыгінальнымі творамі В. Дуніна-Марцінкевіча кола падзей большае, а таму лексіка багацейшая. Тут вялікая колькасць гістарызмаў (*аднадворца, кашталян, лоучы, падчашы, падкаморы, возны, паспалітае рашэнне*), шмат слоў, якія адносяцца да грамадска-падлітычнага жыцця: *адвакат, акадэмія, вольнасць, герб, дробная шляхта, карта, закон, рада, канцылярыя, трыбунал, сакратар*. Многія словы суправаджаюцца тлумачэннем: *Palityka – szto dziejecca ú swajom krai i ú zamorji, jak karali prawiać narodam, - dobraje czy błahoje żyćcio ludziej pad jaho praúleńniam, zawiecca palitykaj* (Палітыка – што дзеецца ў сваім краі і ў замор’і, як каралі правяць народам, – добрае благое жыццё людзей пад яго праўленнем завецца палітыкай) [16, с. 59].
- У перакладзе ёсць паланізмы (*бэндзе, нех, круляванне, локець, мыслівы, тлусты*), русізмы (*абсуждаць, бальшы, блісцяшчы, падаянне, паймаць, таска, сейчас, яшчо*).